# Спрэчка за царкву

“Ніва” ў нумары 37 ад 12 верасьня 1993 г. зьмясьціла фрагмэнт інтэрвію Міхася Белямука зь япіскапам Наваградзкім і Лідзкім Канстанцінам, якое друкавалася ў беларускім часопісе “Полацак” (выходзіць ён у Кліўлэндзе ў Злучаных Штатах Амэрыкі).

У інтэрвію ўладыка Канстанцін расказвае пра зьдзекі, якія чынілі над ім лідзкія каталікі ў сувязі са спрэчкай за царкву сьв. Міхаіла Архангела (Архістратэга) у Лідзе. Са сказанага ўладыкам Канстанцінам немагчыма здагадацца, чаму гэта каталікі так зацята змагаюцца супраць вяртаньня царквы праваслаўным. Справа ў тым, што царква гэтая была пабудаваная ў 1797—1825 гадах як рымска–каталіцкі Іосіфаўскі касьцёл ордэну піяраў. Каб было цікавей, на пабудову каталіцкага храму ахвяраваў 5000 рублёў расейскі імпэратар Павал I. Гэты цар зь нянавісьці да сваёй маці Кацярыны II рабіў усё наадварот. Паколькі Кацярына праводзіла, напрыклад, палітыку “абрусеньня” Беларусі, дык Павал I увёў палітыку “адрусеньня”, якая сапраўды скіраваная была супраць тутэйшай беларушчыны, ды на карысьць пальшчызны і Рымска–Каталіцкай царквы (Павал I быў вялікім магістрам каталіцкага ордэну мальтыйскіх кавалераў!). Толькі Мікалай I вярнуў расейскую палітыку ў “кацярынінскае” рэчышча. Дапамаглі гэтаму самі палякі, узьнімаючы Лістападаўскае паўстаньне 1830—1831 гадоў. У 1832 г. і зачынены быў лідзкі кляштар піяраў. Касьцёл праіснаваў да наступнага, Студзеньскага паўстаньня 1863 году (у тым часе, у 1842 г. ён гарэў), калі быў перароблены на праваслаўную царкву Міхаіла Архангела.

Гэтым і тлумачыцца неміласэрнасьць каталікоў у дачыненьні да асобы ўладыкі Канстанціна ды нерашучасьць кіраўніцтва гораду.

Каму тады перадаць царкву, перарobленую з касьцёла, пабудаванага на грошы царавар’ята?*

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1993. 10 кастрычніка. № 41. С. 5.

* У рэшце рэшт спрэчны будынак быў у 1996 г. перададзены Праваслаўнай царкве, цяпер гэта — Катэдральны сабор сьв. Арханёла Міхаіла. — **Рэд.**